## Тэма 9.1. Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы: Румынія, Венгрыя, Усходняя Германія (ГДР) у 1945 г. – 1990 г.

1. Краіны рэгіёну ў перыяд народна-дэмакратычных пераўтварэнняў.
2. Пераход да дыктатуры пралетарыяту і савецкай мадэлі сацыялізму.
3. Крызіс сталінскай мадэлі сацыялізму ў 1950-я гг.
4. Аўтарытарны сацыялізм у 1960-я – сярэдзіне 1970-х гг.
5. Нарастанне крызісных з'яў у сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сферах у сярэдзіне 1970-х – 1980-я гг.
6. Дэмакратычныя рэвалюцыі 1989–1990 гг.

### Літаратура

Очерки политической истории стран Центральной и Юго-Восточной Европы. Конец XX – начало XXI века : [коллективная монография] / Ин-т славяноведения РАН. – Санкт-Петербург: Нестор-История, 2020. – 462 с.

Лазько, Г. Г. Авторитарно-бюрократический социализм в европейских странах: становление и крах : пособие для учителей / Г. Г. Лазько. –Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 1992. – 37 с.

Новейшая история стран Европы и Америки. XX век. В 3. ч. / Под ред. А. М. Родригеса и М.В.Пономарева. – М.: Гуманитар. Изд. Центр «Владос», 2001. – Ч. 3. – 336 с.

История новейшего времени стран Европы и Америки. 1945–2000 гг. / Под ред. Л. С. Белоусова, Е. Ф. Языкова и др. – М.: Простор, 2003. – 480 с.

Патрушев, А. И. Германия в XX веке: учебное пособие / А. И. Патрушев. – М.: Дрофа, 2004. – 432 с.

История Германии : учебное пособие : в 3 тт. / Под общ.ред. Б. Бонвеча, Ю. В. Галактионова. – М.: КДУ, 2008. – Т. 2. – 672 с.

Смирнова Н. Д. История Албании в XX веке / Н.Д. Смирнова; Ин-т всеобщей истории / Н. Д. Смирнова. – М.: Наука, 2003. – 431 с.

Контлер, Ласло. История Венгрии. Тысячелетие в центре Европы / Пер. с англ. / Ласло Контлер – М: Издательство «Весь Мир», 2002. – 656 с.

История Румынии / И. Болован, И.-А. Поп (координаторы) и др. / Пер. с рум. – М.: Издательство «Весь мир», 2005. – 680 с.

**1**. У час Другой сусветнай вайны Румынія і Венгрыя з'яўляліся саюзнікамі нацысцкай Германіі. Таму пасля вайны на іх тэрыторыі дзейнічала саюзная кантрольная камісія з прадстаўнікоў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі. Тут знаходзіліся савецкія войскі. Ва ўмовах савецкай акупацыі хутка набіралі ўплыў камуністычныя партыі.

Па ініцыятыве Камуністычнай партыі Румыніі (КПР) у кастрычніку 1944 г. была створана шырокая кааліцыя дэмакратычных сіл – Нацыянальна-дэмакратычны фронт (НДФ) у складзе КПР, Сацыял-дэмакратычнай партыі (СДП), прафсаюзаў, Фронта земляробаў, Саюза патрыётаў, Саюза венгерскіх працоўных у Румыніі (МАДАС). Буржуазныя Нацыянал-ліберальная (НЛП) і Нацыянал-царанісцкая (НЦП) партыі адмовіліся ўвайсці ў НДФ. У сакавіку

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1945 г. кароль Міхай пад ціскам камуністаў пагадзіўся на стварэнне кааліцыйнага ўрада НДФ на чале з лідарам Фронта земляробаў П. Грозам.

У Венгрыі на падставе праграмы, распрацаванай Камуністычнай партыяй (КПВ), у снежні 1944 г. быў створаны Венгерскі нацыянальны фронт незалежнасці (ВНФН), у які ўвайшлі Камуністычная партыя Венгрыі (КПВ), Сацыял-дэмакратычная партыя (СДП), Нацыянал-сялянская партыя (НСП), Партыя дробных сельскіх гаспадароў (ПДСГ), Буржуазна-дэмакратычная партыя (БДП) і прафсаюзы. Часовы Нацыянальны сход, скліканы ў Дэбрэцэне 21 снежня 1944 г., сфарміраваў часовы ўрад ВНФН, у склад якога разам з прадстаўнікамі партый фронта ўвайшлі чатыры харцісты.

Іншая сітуацыя была ў Албаніі. Адразу пасля вайны тут вядучай палітычнай сілай стала Камуністычная партыя, якая сканцэнтравала ў сваіх руках усю паўнату ўлады. Гэта звязана з тым, што пад яе кіраўніцтвам была вызвалена тэрыторыя краіны і камуністы абапіраліся на Нацыянальна-вызваленчую армію. З яе дапамогай палітычныя праціўнікі кампартыі былі разгромлены.

Да пачатку Другой сусветнай вайны неславянскія краіны Цэнтральна-Усходняй Еўропы (за выключэннем Усходняй Германіі) з'яўляліся аграрнымі. Яны не адносіліся да ліку развітых капіталістычных дзяржаў. Таму аб'ектыўна перад Венгрыяй, Румыніяй і Албаніяй стаяла задача правядзення буржуазна-дэмакратычных рэформ, якія расчысцілі б шлях для развіцця капіталізму. Вайна парадзіла новыя праблемы: аднаўленне разбуранай эканомікі, адхіленне ад улады, адказнасць тых палітычных і прадпрымальніцкіх колаў, якія падтрымалі фашысцкую агрэсію (Венгрыя, Румынія), ці супрацоўнічалі з акупантамі (Албанія).

На вырашэнне гэтых задач першапачаткова і нацэльваліся нацыянальныя франты ў Румыніі і Венгрыі. У ажыццяўленні дадзенай праграмы былі зацікаўлены самыя шырокія пласты грамадства: сялянства, рабочыя, большасць буржуазіі. Да ліку праціўнікаў пераўтварэнняў адносілася толькі тая частка буржуазіі, якая супрацоўнічала з акупантамі, ці была апорай аўтарытарных рэжымаў. У антыдэмакратычным лагеры знаходзілася асноўная маса памешчыкаў.

У лістападзе 1945 г. парламенцкія выбары ў Венгрыі прынеслі пераканаўчую перамогу ПДСГ – 57 % галасоў і 245 мандатаў у Нацыянальным сходзе. У ўрадзе на чале з З. Цілдзі (ПДСГ) палову міністэрскіх пасад займалі прадстаўнікі гэтай партыі. 1 лютага 1946 г. Венгрыя была абвешчана рэспублікай, першым яе прэзідэнтам быў выбраны З. Цілдзі. На пасадзе прэм’ер-міністра яго замяніў адзін з лідараў ПДСГ Ф. Надзь.

У Румыніі на парламенцкіх выбарах у лістападзе 1946 г. перамогу атрымалі партыі, аб’яднаныя ў Блок дэмакратычных партый (БДП): КПР, СДП, Фронт земляробаў, створаная на базе былога Саюза патрыётаў Нацыянальна-народная партыя (ННП). З 414 дэпутатаў, выбраных у парламент, 347 прадстаўлялі палітычныя партыі БДП. Лідары НЛП і НЦП,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

якія пацярпелі паражэнне, аб’явілі аб адмове ўдзельнічаць у рабоце парламента.

Абвастрэнне палітычнай барацьбы было звязана з правядзеннем сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў – аграрнай рэформы і нацыяналізацыі прамысловасці і банкаў. За іх ажыццяўленне выступалі як камуністычныя, так і ўплывовыя сялянскія партыі Румыніі (Фронт земляробаў, НЦП) і Венгрыі (ПДСГ і НСП). Лідары сялянскіх партый вылучалі сваю канцэпцыю перабудовы вёскі: яны лічылі, што трэба ствараць буйныя фермы, умацоўваць сярэднія і заможныя гаспадаркі, выступалі супраць экспрапрыяцыі ўладанняў у 50–100 га. Камуністычныя партыі бачылі ў аграрных рэформах не толькі сродак дасягнення сацыяльнай справядлівасці ў вёсцы, але і магчымасць для далейшага абмежавання капіталістычных адносін.

Законы аб аграрнай рэформе ў Венгрыі і Румыніі былі прыняты ў сакавіку 1945 г., але падзел памешчыцкай зямлі пачаўся яшчэ ў канцы 1944 г. Рэформы праводзіліся па прынцыпе «зямля тым, хто яе апрацоўвае». У Венгрыі канфіскацыі падлягалі землі ваенных злачынцаў і буйныя маёнткі плошчай звыш 57 га (1 хольд – 0,57 га). Адчужалі за выкуп памешчыцкія землі памерам звыш 57 га і землі сельскай буржуазіі плошчай звыш 114 га. За царквой і манастырамі захоўваліся землі плошчай да 57 га. У Румыніі на першым этапе рэформы канфіскавалася зямля фашыстаў, ваенных злачынцаў, здраднікаў, памешчыцкія землі плошчай звыш 50 га. Каралеўскія і царкоўныя землі на гэтым этапе не закраналіся. На працягу 1948–1949 гг. у Румыніі былі прыняты дадатковыя законы, якія канчаткова ліквідавалі буйное землеўладанне, у тым ліку каралеўскай сям’і і т. зв. «узорных маёнткаў».

Зямля перадавалася батракам, беззямельным і малазямельным сялянам (у некаторых выпадках і сярэднякам) у прыватную ўласнасць, але з абмежаваннямі на куплю-продаж, арэнду. За яе прадугледжвалася невялікая плата, роўная кошту сярэдняга гадавога ўраджаю з участка, якая выплачвалася на працягу 10–20 гадоў. Частка зямлі была перададзена ў дзяржаўны фонд. Ва ўласнасць дзяржавы паступілі сельскагаспадарчыя машыны, якія раней належалі памешчыкам. У выніку рэформы было ліквідавана буйное памешчыцкае землеўладанне.

Аграрныя пераўтварэнні суправаджаліся вострай палітычнай барацьбой. У такіх умовах у Венгрыі КПВ прапанавала СДП, прафсаюзам і НСП стварыць у рамках ВНФН больш цесны саюз – Левы блок, які хутка набыў вялікі ўплыў у краіне. Пасля акцый Левага блока ў маі 1946 г. Нацыянальны сход прыняў закон аб забароне адымаць у сялян і вяртаць былым гаспадарам маёмасць, адабраную і размеркаваную па рэформе да 1 студзеня 1946 г. У Румыніі падчас моцнай засухі 1945–1946 гг. памешчыкі спрабавалі вярнуць сабе частку канфіскаванай у іх зямлі. Аднак летам 1947 г. быў прыняты закон, згодна з якім суды не мелі права пераглядаць вынікі зямельнай рэформы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У Венгрыі і Румыніі, дзе былі моцнымі пазіцыі нацыянальнай буржуазіі, камуністычныя партыі ўзялі курс на паступовае яе выцісканне з вытворчасці пры дапамозе рабочага і дзяржаўнага кантролю. Так, праграма аднаўлення эканомікі, распрацаваная КПВ у маі 1945 г., прадугледжвала спачатку перавод пад дзяржаўнае кіраванне найбольш важных для пераадолення эканамічнага крызісу прыватных прадпрыемстваў (вугальныя шахты, электрастанцыі) і толькі потым – нацыяналізацыю. Са снежня 1946 г. у Венгрыі пачалася нацыяналізацыя ўсёй цяжкай прамысловасці. У Румыніі ў снежні 1946 быў прыняты закон аб поўнай нацыяналізацыі банкаў. Гэта сведчыла, што кампартыі Румыніі і Венгрыі пачалі выходзіць за межы праграмы нацыянальных франтоў.

Пачалося выцісканне ліберальна-буржуазных партый з урада і парламента. Як паказалі першыя пасляваенныя выбары ў Венгрыі і Румыніі, якія былі дастаткова дэмакратычнымі, камуністы мелі падтрымку 1/4 – 1/5 выбаршчыкаў. Але кампартыі атрымлівалі падтрымку з боку савецкіх ваенных адміністрацый, з іх дапамогай усталявалі кантроль над сілавымі структурамі. Гэта значна ўзмацняла пазіцыі камуністаў у барацьбе з палітычнымі апанентамі.

У Венгрыі палітычная барацьба абвастрылася вакол абмеркавання трохгадовага плана аднаўлення эканомікі, праект якога быў апублікаваны ў студзені 1947 г. Супраць плана выступілі ПДСГ і СДП, якія асабліва настойліва прапанавалі адмовіцца ад далейшай нацыяналізацыі прамысловасці і ад увядзення прагрэсіўнага падатку на маёмасць – адной з галоўных крыніц фінансавання плана. У канцы 1946 – пачатку 1947 г. была раскрыта т. зв. «антырэспубліканская змова», у ўдзеле ў якой былі абвінавачаны лідары правага крыла ПДСГ. Старшынёй ПДСГ стаў прадстаўнік левага крыла І. Добі, новым прэм’ер-міністрам – таксама член гэтай партыі Л. Дзіньеш. Партыі Левага блока па ініцыятыве КПВ і СДП патрабавалі правядзення перавыбараў у парламент. У выніку ён быў распушчаны і на 31 жніўня 1947 г. былі прызначаны новыя выбары, якія прынеслі перамогу партыям ВНФН – 61% галасоў, 271 мандат. Самай уплывовай сярод іх стала КПВ – 22 % галасоў супраць 17 % у 1945 г. ПДСГ страціла за той жа час 71 % галасоў. Пасля выбараў быў створаны новы ўрад ВНФН, у які ўвайшлі пяць міністраў ад ВКП, чатыры – ад СДП, чатыры – ад ПДСГ, два – ад НСП. Урад узначаліў зноў Л. Дзіньеш. Парламент пасля выбараў атрымаў новую назву – Дзяржаўны Савет.

Спецыфіка сітуацыі ў Усходняй Германіі заключалася ў тым, што да 1949 г. яна з'яўлялася савецкай зонай акупацыі, улада належала савецкай ваеннай адміністрацыі. У адпаведнасці з рашэннямі Патсдамскай канферэнцыі СВАГ ліквідавала стары дзяржаўны апарат, забараніла нацысцкую партыю, наклала арэст на маёмасць ваенных злачынцаў, нацысцкай партыі і дзяржавы (кастрычнік 1945 г.), дазволіла дзейнасць антыфашысцкіх дэмакратычных партый, прафсаюзаў і мясцовых органаў самакіравання (чэрвень – ліпень 1945 г.). У ліпені 1945 г. быў створаны Дэмакратычны блок Камуністычнай партыі Германіі (КПГ), Сацыял-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дэмакратычнай партыі Германіі (СДПГ), Хрысціянска-дэмакратычнага саюза (ХДС), Ліберальна-дэмакратычнай партыі Германіі (ЛДПГ) для барацьбы за ажыццяўленне дэмакратычных рэформ. У Усходняй Германіі меўся дастаткова шматлікі рабочы клас, які прэтэндаваў на ролю вядучай сілы ў дэмакратычных пераўтварэннях. У красавіку 1946 г. адбылося аб'яднанне КПГ і СДПГ у Сацыялістычную адзіную партыю Германіі (САПГ), якая па сваёй ідэалогіі стала камуністычнай. На выбарах у абшчынныя і раённыя органы кіравання, якія адбыліся восенню 1946 г., САПГ атрымала больш за 50 % галасоў, у ландтагі – 47,5 %. З 5 прэм'ер-міністраў зямель – 4 належалі да САПГ. Такім чынам, у Усходняй Германіі ўжо ў канцы 1946 г. усталявалася ўлада САПГ, якая абапіралася на падтрымку СВАГ. Летам 1948 г. былі створаны Дэмакратычная сялянская партыя Германіі (ДСПГ) і Нацыянальна-дэмакратычная партыя Германіі, тым самым была канчаткова сфарміравана шматпартыйная сістэма.

Сваю спецыфіку мела правядзенне аграрнай рэформы ў Усходняй Германіі. На аснове законаў, прынятых у асобных землях з 3 па 10 верасня 1945 г., канфіскаваліся землі нацыстаў, ваенных злачынцаў, памешчыкаў і надзелы плошчай звыш 100 га. Зямля перадавалася ў прыватную ўласнасць сялян за плату. У выніку 2,2 млн га былі перададзены 560 тыс. батракоў, беззямельных і малазямельных сялян. 1 млн га перайшоў ва ўласнасць установ, прадпрыемстваў.

У сакавіку 1946 г. СВАГ перадала арыштаваную ўласнасць мясцовым органам кіравання. Да канца 1947 г. дзяржаўны сектар даваў 58 % прамысловай прадукцыі. У той жа час ва Усходняй Германіі ў 1948 г. захоўвалася яшчэ 36 тыс. капіталістычных прадпрыемстваў, на долю якіх прыходзілася каля 40 % прамысловай прадукцыі.

У выніку пераўтварэнняў 1944–1947 гг. у краінах Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы (ЦПУЕ) узнікла новая форма арганізацыі грамадства – народная дэмакратыя. Яна спалучала палітычны плюралізм, кааліцыйны характар улады, элементы даваеннага дзяржаўнага ладу з вядучай ролю кампартый, наянальнымі франтамі, дапускала разнастайнасць форм уласнасці. У дакументах кампартый народная дэмакратыя спачатку вызначалася як адметны ад дыктатуры пралетарыяту паступовы, мірны шлях да сацыялізму. Прыхільнікамі такога шляху былі і сацыял-дэмакраты. Толькі Албанія адразу пасля вайны пайшла па шляху ўсталявання аднапартыйнай камуністычнай дыктатуры.

**2.** Тэндэнцыя пераходу ад агульнадэмакратычных рэформ да сацыялістыячных пераўтварэнняў стала дамінуючай у краінах ЦПУЕ з сярэдзіны 1947 г. Паварот у бок будаўніцтва сацыялізму быў у многім абумоўлены міжнароднай абстаноўкай. Пасля вайны СССР і краіны ЦПУЕ аб'ядноўвала сумесная зацікаўленасць у вырашэнні пытанняў пасляваеннага ўрэгулявання, у забеспячэнні гарантый супраць аднаўлення ваеннай магутнасці Германіі. З пачаткам «халоднай вайны» ў савецкай палітыцы ўзмацнілася тэндэнцыя па пераўтварэнню краін ЦПУЕ ў сваіх сацелітаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Савецкае кіраўніцтва лічыла, што гэта неабходна для забеспячэння бяспекі СССР. Краіны ЦПУЕ, на думку Масквы, маглі стаць надзейнымі саюзнікамі СССР у выпадку, калі ўлада ў іх будзе належаць камуністам.

У 1947 г. тры падзеі ў міжнародным жыцці адыгралі ключавую ролю ў павароце краін ЦПУЕ да будаўніцтва сацыялізму. Па-першае, адбылося падпісанне мірных дагавораў з саюзнікамі Германіі 10 лютага. Гэта павысіла незалежнасць савецкай палітыкі ў дачыненні да краін рэгіёна ад ЗША і Вялікабрытаніі. Па-другое, прыняцце «плана Маршала» сведчыла, што СССР не можа канкурыраваць з ЗША ў эканамічнай вобласці. У такой сітуацыі кіраўніцтва СССР вырашыла кампенсаваць сваю эканамічную слабасць узмацненнем ваеннай і ідэйна-палітычнай залежнасці краін ЦПУЕ ад Масквы. Для гэтага трэба было ўсталяваць рэжымы цалкам паслухмяныя СССР. Трэцяя падзея – нарада 9 камуністычных партый у г. Шклярска-Парэмба (Польшча) ў верасні 1947. На ёй Жданаў і Маленкоў падверглі крытыцы тэзіс аб магчымасці розных шляхоў пабудовы сацыялізму і заявілі, што ў краінах ЦПУЕ склаліся ўмовы для пабудовы сацыялізму савецкага ўзору. Неабходнасць пераходу да такой мадэлі абгрунтоўвалася ўзнікненнем двух супрацьстаячых лагераў – сацыялістычнага і імперыялістычнага. Абвяшчалася, што толькі камуністычныя партыі праз будаўніцтва савецкай мадэлі сацыялізму здольныя адстаяць суверэнітэт сваіх краін ад пагрозы з боку імперыялізму. На нарадзе было створана Інфармацыянае бюро камуністычных і рабочых партый. Праз яго УКП(б) ажыццяўляла кантроль за дзейнасцю камуністычных партый каб яны «правільна» будавалі сацыялізм.

Адхіліўшы «план Маршала» і прыняўшы канцэпцыю двух варожых лагераў, камуністы краін ЦПУЕ выбралі шлях развіцця, арыентаваны на выкарыстанне вопыту і дапамогі СССР, канцэнтрацыю рэсурсаў у руках дзяржавы. У сувязі з новым курсам у краінах ЦПУЕ рэзка абвастрылася палітычная барацьба. Яна вялася вакол розных пытанняў. Скажам, пры правядзенні аграрных рэформ камуністы рэзка сутыкнуліся з сялянскімі партыямі. Лідары сялянскіх партый – ПДСГ у Венгрыі, Нацыянал-цараніцкай у Румыніі – лічылі, што аграрныя пераўтварэнні павінны быць нацэлены на стварэнне буйных ферм, спрыяць развіццю сярэдніх і заможных гаспадарак. Камуністы ж выступалі за ўраўняльнае землекарыстанне. Бачылі канчатковую мэту аграрных пераўтварэнняў у стварэнні калектыўных гаспадарак. Перамагла лінія кампартый. На першым этапе аграрных рэформ была створана вялікая кольскасць дробных і сярэдніх сялянскіх гаспадарак (сярэдні памер 3,5 га). Такія гаспадаркі лягчэй было прымусіць да кааперацыі, чым буйныя. Па пытаннях пераўтварэння ў прамысловасці камуністы ўступілі ў супрацьстаянне не толькі з буржуазнымі партыямі, але і з сацыял-дэмакратамі. Апошнія выступалі за змешаную эканоміку, у якой дзяржаўны сектар не павінен быў адыгрываць галоўнай ролі.

Кампартыі з нецярпімасцю ставіліся да спроб іншых партый адстойваць свае пазіцыі па пытаннях развіцця краін ЦПУЕ. Камуністы ўзялі курс на разгром усялякай апазіцыі і пераўтварэнне нацыянальных франтоў з кааліцыйных арганізацый розных партый у арганізацыі, якія цалкам

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

кантралюючца камуністычнымі партыямі. Для разгрома апазіцыйных партый выкарыстоўваліся сфабрыкаваныя справы ў контррэвалюцыйнай змове. У Венгрыі ў чэрвені 1947 г. была разгромлена вядучая палітычная партыя – ПДСГ. На чале яе паўстала новае кіраўніцтва, якое ўжо ішло ў фарватары палітыкі камуністаў. Але і гэта не выратавала партыю ад роспуску напярэдадні парламенцкіх выбараў 21 лістапада 1947 г. Нягледзячы на праследаванне апазіцыі, кампартыя Венгрыі атрымала на іх толькі 22 % галасоў. У дачыненні да сацыялістычных партый камуністы прыбеглі да тактыкі паглынання. Мы гэта ўжо бачылі на прыкладзе Усходняй Германіі. У Венгрыі ў сярэдзіне ліпеня 1948 г. адбыўся аб'яднальны з'езд камуністаў і сацыялістаў. На ім была створана Вянгерская партыя працоўных (ВПП). Яна ў ідэалагічным плане стаяла на камуністычнай платформе. 3 жніўня 1948 г. адзін з лідараў гэтай партыі Сакашыч быў абраны прэзідэнтам краіны.

Каб забяспечыць поўны пераход улады ў рукі ВПП была праведзена рэарганізацыя Нацыянальнага фронта. На яго месцы быў створаны Народны фронт, у якім цалкам панавала ВПП. На парламенцкіх выбарах 15 мая 1949 г. Народны фронт, а фактычна ВПП, атрымаў ужо 95 % галасоў. Гэта азначала ўсталяванне ў Венгрыі аднапартыйнай дыктатуры. Ва ўмовах свабодных выбараў у лістападзе 1945 і лістападзе 1947 гг. венгерскім камуністам не ўдалося атрымаць большасць і прыйсці да ўлады парламенцкім шляхам. Толькі калі з дапамогай СССР і падкантрольных кампартыі сілавых структур была разгромлена апазіцыя, выбары 1949 г. прынеслі ВПП жаданы вынік.

У Румыніі асноўнымі апанентамі кампартыі выступалі Нацыянал-цараністская, Нацыянал-ліберальная і Сацыял-дэмакратычная партыі. У ліпені 1947 г. у Румыніі была забаронена НЦП, восенню адбыліся судовыя працэсы. У лістападзе рашэннем парламента былі выдалены з урада прадстаўнікі НЛП. Правыя элементы былі выдалены з СДП і Фронта земляробаў. 30 снежня 1947 г. дэпутаты парламента Румыніі адзінагалосна прынялі закон аб ліквідацыі манархіі і абвяшчэнні Румыніі народнай рэспублікай.

Сацыял-дэмакраты вымушаны былі пайсці на аб'яднанне з камуністамі. На аб'яднальным з'ездзе ў сакавіку 1948 г. была створа Румынская рабочая партыя (РРП), стаяўшая ў ідэалагічным плане на камуністычных пазіцыях. Нацыянальна-дэмакратычны фронт быў ліквідаваны. На яго месцы стварыўся Фронт народнай дэмакратыі цалкам пад кантролем РРП. 28 сакавіка 1948 г. Фронт народнай дэмакратыі перамог на парламенцкіх выбарах (93 % галасоў). Такім чынам, і ў Румыніі камуністы змаглі ўсталяваць сваю аднапартыйную дыктаруру толькі пасля разгрома апазіцыі.

Юрыдычна змены ў палітычнай сітуацыі ў Румыніі і Венгрыі былі замацаваны ў канстытуцыях Румынскай Народнай Рэспублікі (красавік 1948 г.) і Венгерскай Народнай Рэспублікі (жнівень 1949 г.). У адпаведнасці з канстытуцыямі на працягу 1948–1950 гг. была праведзена рэарганізацыя органаў цэнтральнай і мясцовай улады, якая суправаджалася чысткамі адміністрацыйнага апарату, адбыліся выбары ў мясцовыя органы ўлады. У Румыніі (ліпень 1950 г.) быў уведзены новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У Усходняй Германіі ў канцы 1947 г. быў арганізаваны рух Нямецкага народнага кангрэса. Першы кангрэс адбыўся ў снежні 1947 г., другі – у сакавіку 1948 г. Кангрэс прэтэндаваў на тое, каб стаць вышэйшым органам улады ў маштабах усёй Германіі. Аднак гэтыя прэтэнзіі не мелі лігітымнай падставы, бо ўсеагульныя свабодныя выбары дэлегатаў кангрэса не праводзіліся. У маі 1949 г. Нямецкі народны кангрэс зацвердзіў канстытуцыю. Каб прыкрыць аднапартыйную дыктатуры быў створаны Народны фронт дэмакратычнай Германіі. У яго ўвайшлі ХДС, ЛДПГ, але рэальна Народны фронт знаходзіўся пад поўным кантролемі САПГ.

7 кастрычніка 1949 г. была абвешчана Германская Дэмакратычная Рэспубліка (ГДР). Прэзідэнтам ГДР быў абраны Вільгельм Пік, урад узначаліў Ота Гратэваль. Канстытуцыя ГДР была пабудавана па ўзоры Веймарскай канстытуцыі. Яна дэкларавала асноўныя грамадзянскія правы, у тым ліку права на забастоўку, абарону прыватнай уласнасці. 10 кастрычніка 1949 г. савецкі ўрад перадаў Часоваму ўраду ГДР функцыі кіравання ад СВАГ, а 15 кастрычніка прызнаў ГДР.

Такім чынам, у краінах ЦПУЕ ў другой палове 1947–1949 гг. адбыўся пераход да савецкай мадэлі сацыялізму, да дыктатуры пралетарыяту, якая маскіравалася пад назвай «народная дэмакратыя». Фармальна лічылася, што ўлада ў сацыялістычных краінах ЦПУЕ належыць шырокім кааліцыям – народным франтам. Але фактычна яны знаходзіліся пад поўным кантролем камуністаў. У краінах «народнай дэмакратыі» пачаліся рэпрэсіі. У ходзе іх былі адхілены ад кіраўніцтва тыя дзеячы кампартый, якія спрабавалі адстойваць нацыянальныя, адрозныя ад савецкага, шляхі будаўніцтва сацыялізму. Па аналогіі з культам асобы Сталіна пачалі фарміравацца культы асобы мясцовых камуністычных лідараў: Хаджы ў Албаніі, Ракашы ў Венгрыі, Геаргіу-Дзежа ў Румыніі.

Разам з усталяваннем аднапартыйных камуністычных дыктатур адбыліся карэнныя змены ў сацыяльна-эканамічных сістэмах краін ЦПУЕ. Сацыяльна-эканамічныя мерапрыемствы, праведзеныя ў 1948–1949 гг., былі накіраваныя на завяршэнне нацыяналізацыі прамысловасці і калектывізацыю сельскай гаспадаркі. У Румыніі гэтыя задачы вырашаліся ў ходзе выканання гадавых планаў эканамічнага развіцця 1949 і 1950 гг., у Венгрыі – трохгадовага плана аднаўлення эканомікі (1947–1949 гг.). У Румыніі 11 чэрвеня 1948 г. быў выдадзены закон аб нацыяналізацыі ўсіх буйных і сярэдніх прадпрыемстваў. У выніку доля дзяржаўнага сектара ў прамысловасці Румыніі, як і ў Албаніі, на пачатку 1950-х гг. перавысіла 90 %. У Венгрыі 21 лістапада 1947 быў выдадзены закон аб нацыяналізацыі банкаў, а 25 сакавіка 1948 г. – прадпрыемстваў з колькасцю работнікоў больш за 100 чалавек. У Венгрыі ў пачатку 1950-х гг. доля дзяржсектара дасягала 80 %. У Усходняй Германіі ў 1948–1949 гг. былі нацыяналізаваны ўсе буйныя і сярэднія прадпрыемствы. Больш марудна ішоў працэс калектывізацыі сельскай гаспадаркі – у сярэдзіне 1950-х гг. сельскагаспадарчым кааператывам у Румыніі належала 26 % апрацоўваемай зямлі, у Венгрыі – 32 %, у Албаніі – 13 %. Праграма аднаўлення народнай гаспадаркі Усходняй

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Германіі, распрацаваная на II з’ездзе САПГ (верасень 1947 г.), была пакладзена ў аснову двухгадовага плана 1948–1949 гг.

У ўсіх краінах, якія прыступілі да будаўніцтва сацыялізму, пачаўся працэс паскоранай індустрыялізацыі з прыярытэтам на развіццё цяжкай прамысловасці. Гэта вяло да адставання тых галін, якія выпускалі тавары народнага спажывання. Сродкі на індустрыялізацыю ў адпаведнасці з савецкім вопытам браліся з сельскай гаспадаркі. Гэта замаруджвала тэмпы яе развіцця. Так, у Румыніі на развіццё цяжкіх галін прамысловасці – металургічнай, энергетычнай, нафтавай, хімічнай, машынабудаўнічай – было накіравана 57,7 % усіх капіталаўкладанняў у прамысловасць. У Венгрыі з агульнай сумы капіталаўкладанняў у народную гаспадарку ў 35 млрд форытаў на развіццё прамысловасці было накіравана 17 млрд. У 1951 г. планавыя заданні былі падвышаны: сума капіталаўкладанняў павялічвалася да 85 млрд фарытаў, аб’ём прамысловай вытворчасці – на 200 % (а не на 80 %, як планавалася раней).

Такім чынам, на мяжы 1940-х – 1950-х гг. у краінах ЦПУЕ адбыўся пераход да камандна-адміністрацыйнай эканомікі з панаваннем дзяржаўнай формы ўласнасці і прыярытэтным развіццём цяжкай прамысловасці.

**3.** Ужо ў сярэдзіне 1950-х гг. сталінская мадэль сацыялізму ў шэрагу краін сутыкнулася з крызісам. З неславянскіх краін ён закрануў Венгрыю і ГДР, але абыйшоў Албанію і Румынію. Як бачна, крызіс закрануў краіны, якія мелі больш высокі ўзровень сацыяльна-эканамічнага развіцця. Больш высокая палітычная культура, захаванне элементаў грамадзянскай супольнасці спрыялі захаванню апазіцыйных настрояў. Іх носьбітамі выступалі інтэлігенцыя, дастаткова шырокія колы сялянства, частка высокакваліфікаваных рабочых. Улада ж абапіралася пераважна на рабочых – выхадцаў з вёскі ў першым пакаленні, на беднейшае сялянства, на бюракратычны апарат.

У 1951 г. у Румыніі «кулакі» былі пазбаўлены выбарчых праў. У Венгрыі працэс раскулачвання закрануў кожную чацвёртую сялянскую сям’ю. Гэта прывяло да скарачэння сельскагаспадарчай вытворчасці, абвастрэння харчовай праблемы. Каб забяспечыць сельскагаспадарчай сыравінай і харчаваннем горад, уводзіліся павялічаныя абавязковыя пастаўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. У 1952 г. у ВНР пачалося адабранне яе лішкаў у сялян. Адставанне сельскай гаспадаркі і лёгкай прамысловасці прывяло да ўвядзення ці аднаўлення картачнай сістэмы на харчовыя і прамысловыя тавары ў шэрагу краін (у ВНР картачная сістэма была ўведзена ў 1951 г., у РНР яна дзейнічала да 1954 г.), да падзення жыццёвага ўзроўню насельніцтва. Сацыялістычныя краіны дабіліся поспехаў у стварэнні і развіцці цяжкай прамысловасці. Але гэта было дасягнута за кошт змяншэння ўкладанняў у іншыя галіны эканомікі. У выніку вытворочасць спажывецкіх тавараў зменшылася. Індустрыялізацыя патрабавала велізарных сродкаў і іх мабілізацыя часта адбывалася за кошт змяншэння даходаў насельніцтва:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нізкая зарплата, прымусовыя дзяржаўныя займы. Гэта з’явілася адной з крыніц незадаволенасці, якая прывяла да палітычных крызісаў 1950-х гг.

Смерць Сталіна ў сакавіку 1953 г. выклікала ў сацыялістычных краінах спадзяванні на перамены. Кіраўніцтва ГДР у чэрвені 1953 г. абвясціла новы курс. Прадугледжвалася ўмацаванне законнасці, г. з. згортванне рэпрэсій, павелічэнне выпуску спажывецкіх тавараў. Складанасць сітуацыі для правячага рэжыму ГДР была ў тым, што жыхары краіны ўвесь час параўноўвалі сваё жыццё з жыццём у ФРГ. Гэтае параўнанне было не на карысць ГДР. Напружанасці ў сацыяльна-палітычным жыцці дабаўляла балючая для немцаў праблема расколу Германіі.

З абвяшчэннем новага курса з’явілася надзея на перамены. Штуршком да масавых выступленняў паслужыла рашэнне ўрада аб павелічэнні норм выпрацоўкі для рабочых. У адказ у Берліне і іншых гарадах пачаліся маніфістацыі. Сярод лозунгаў удзельнікаў выступленняў былі як эканамічныя (павышэнне зарплаты, насычэнне рынку таварамі), так і палітычныя – правядзенне свабодных выбараў. З дапамогай савецкіх войск выступленні былі падаўлены. Але ўлады ГДР пайшлі на некаторыя эканамічныя саступкі: знізілі падаткі, цэны на тавары, павялічылі заработную плату, пенсіі, вытворчасць спажывецкіх тавараў, палепшылася медыцынскае абслугоўванне. СССР, са свайго боку, павялічыў пастаўкі харчавання, выдаў крэдыт у 485 млн рублёў, каб не дапусціць росту антысавецкіх настрояў, спыніў спагнанне рэпарацый.

У 1956 г. сацыяльна-палітычны крызіс разразіўся ў Венгрыі. Асуджэнне культу асобы Сталіна на ХХ з’ездзе КПСС для Венгрыі мела наступствам адхіленне ад кіраўніцтва ВПП Ракашы ў ліпені 1956 г. Аднак гэта не разрадзіла сітуацыю. 23 кастрычніка адбыліся дэманстрацыі студэнтаў у Будапешце. Яны патрабавалі развіцця сацыялістычнай дэмакратыі і вяртання да кіраўніцтва ўрадам Імрэ Надзя. Ён лічыўся прыхільнікам рэформ, выступаў за ўсталяванне раўнапраўных адносін з СССР, у папярэдні час падвяргаўся рэпрэсіям. 24 кастрычніка сілавыя службы Венгрыі адкрылі агонь па маніфестантах і ў Будапешт па просьбе кіраўніцтва Венгрыі былі ўведзены савецкія войскі.

Адначасова з рэпрэсіямі пачаліся і саступкі. Надзь быў прызначаны прэм’ер-міністрам, савецкія войскі пакінулі Будапешт. У ходзе паўстання пачаліся забойствы партыйных функцыянераў і супрацоўнікаў спецслужб. 30 кастрычніка І. Надзь сфарміраваў урад з прадстаўнікоў усіх партый, якія дзейнічалі ў краіне ў 1945–1948 гг. Ён ахарактарызаваў адбываўшыеся падзеі як нацыянальна-дэмакратычную рэвалюцыю. ВПП па патрабаванні маніфестантаў была распушчана. 1 лістапада Надзь заявіў аб выхадзе Венгрыі з Арганізацыі Варшаўскага дагавора. Ва ўмовах супрацьстаяння з Захадам гэты акт выклікаў рэзка негатыўную рэакцыю з боку СССР. Прадстаўнікі венгерскага ўрада, якія прыбылі на перамовы з савецкім кіраўніцтвам былі арыштаваны.

Частка дзеячаў ВПП на чале з Янашам Кадарам заявіла аб стварэнні Вянгерскай сацыялістычнай рабочай партыі (ВСРП). 4 лістапада на

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тэрыторыі савецкага Закарпацця Я. Кадар стварыў т. з. Вянгерскі рэвалюцыйны рабоча-сялянскі ўрад, які звярнуўся да СССР з просьбай аб дапамозе ў падаўленні “фашысцкага мецяжу”. Безумоўна, у той момант адзіным легітымным урадам Венгрыі з’яўляўся ўрад І. Надзя, які быў зацверджаны венгерскім парламентам. Тым не менш, у адказ на просьбу рабоча-сялянскага ўрада 4 лістапада савецкія войскі ўвайшлі ў Будапешт і пасля чатырох дзён баёў падавілі паўстанне.

Па сваім характары выступленні ў ГДР у 1953 г. і Венгрыі ў 1956 г. мелі нацыянальна-дэмакратычны характар. Іх удзельнікі выступалі за дэмакратызацыю палітычнага жыцця і адмову ад жорсткай цэнтралізацыі ў эканоміцы. Вялася барацьба і за ўмацаванне нацынальнага суверэнітэту ГДР і Венгрыі, супраць іх залежнасці ад СССР. Гэта былі масавыя выступленні супраць дыктатарскіх рэжымаў.

Нягледзячы на паражэнні, выступленні ў ГДР 1953 г. і Венгрыі 1956 г. не прайшлі бясследна. Пад іх уплывам улады вымушаны былі дапусціць існаванне некаторых элементаў грамадзянскай супольнасці. Так, у ГДР працягвалі дзейнічаць ХДС і ЛДПГ. Захаваўся дробнатаварны сектар у эканоміцы гэтых краін. Такім чынам у Венгрыі і ГДР не адбылося татальнага абдзяржаўлівання ўсіх бакоў грамадскага жыцця. Працэс складвання дыктатырскіх рэжымаў не дасягнуў узроўню таталітарнай дыктатуры, спыніўся на ўзроўні аўтарытарнай дыктатуры.

**4**. Спадзяванні на змены, якія з’явіліся ў значнай часткі насельніцтва сацыялістычных краін пасля ХХ з’езда КПСС, не збыліся. Кіраўніцтва Албаніі ўвогуле асудзіла рашэнні ХХ з’езда КПСС. Кіраўнік РРП Георгіу-Дзеж увогуле заявіў, што ў краіне не было сур’ёзных парушэнняў законнасці і рэабілітаваць няма каго. Толькі ў Венгрыі пад уплывам падзей 1956 г. пачаліся прыкметныя рэформы. У палітычнай сферы быў вылучаны лозунг “Хто не супраць нас, той з намі”. Гэта азначала гатоўнасць да дыялогу з тымі, хто не падзяляў ідэалы сацыялізму, але не выступаў актыўна супраць рэжыму ВСРП. Адбылася лібералізацыя культурнай палітыкі. Венгры атрымалі магчымасць свабоднага выязду за мяжу. Мясцовае самакіраванне атрымала рэальныя правы. У 1960-я гг. у Венгрыі пачалася эканамічная рэформа. Было адменена татальнае планаванне ў эканоміцы. Прадпрыемствы атрымалі больш самастойнасці ў гаспадарчай дзейнасці. Дзяржаўная і кааператыўная формы ўласнасці атрымалі сапраўды роўныя правы. Існаваў дробнатаварны прыватны сектар. На вёсцы сяляне атрымалі права выходзіць з кааператываў і купляць зямлю ў прыватную ўласнасць. Венгрыя не толькі забяспечыла сябе харчаваннем, але пачала яго экспарт.

Замаруджванне тэмпаў эканамічнага росту штурхала да эканамічных рэформ і іншыя сацыялістычныя краіны. У ГДР былі створаныя буйныя аб’яднанні дзяржаўных прадпрыемстваў, якім была дадзена пэўная самастойнасць у вырашэнні пытанняў вытворчасці, у распрацоўцы планаў развіцця. Ствараліся вытворчыя камітэты працоўных, уводзіліся эканамічныя стымулы да працы. Павялічвалася дапамога дзяржавы дробнатаварнаму

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сектару і змешаным прадпрыемствам. Гэта прывяло да павелічэння прыросту нацыянальнага даходу з 3,5 % у 1964 да 5,2 % у 1968 г.

У Румыніі падрыхтоўка гаспадарчай рэформы была завершана ў снежні 1967 г., калі Нацыянальная канферэнцыя РКП прыняла дырэктывы па ўдасканаленні планавання і кіраўніцтва эканомікай. Была створана новая арганізацыйная сістэма прамысловасці, у якой прадпрыемствы атрымалі большую самастойнасць. У вёсцы на базе дзяржаўных гаспадарак пачалі стварацца гаспадарча-разліковыя спецыялізаваныя фермы. З 1968 г. была ўведзена новая сістэма аплаты працы, адбылося яе павышэнне ў сярэднім на 12 %. З 1969 г. пачалі стварацца прамысловыя аб'яднанні. У выніку рэформы эканамічны рост працягваўся да сярэдзіны 1970-х гг. У 1966–1970 гг. ён склаў 7,6 %, у 1971–1975 гг. – 11,3 %.

Аднак эканамічныя рэформы мелі абмежаваны эфект, таму што іх мэтай была толькі частковая змена каманднa-адміністрацыйнай сістэмы кіравання адзяржаўленай эканомікі праз уключэнне ў яе элементаў рынычных адносін. Да таго ж нават першыя крокі рэформ сустрэлі супраціўленне кансерватыўна-дагматычных сіл і бюракратыі. Рэформы праводзіліся непаслядоўна і ў большасці выпадкаў былі згорнуты. Паўплывалі на ўзмацненне кансерватызму спыненне аналагічных рэформ у СССР, падзеі 1968 г. у Чэхаславакіі. У ГДР, напрыклад, у 1972 г. быў ажыццёўлены перавод у дзяржаўную ўласнасць большасці змешаных і прыватных прадпрыемстваў (з выплатай кампенсацыі), у выніку доля дзяржаўных прадпрыемстваў у прамысловай вытворчасці павялічылася з 83 да 99 %.

У Албаніі ніякія рэформы не праводзіліся. Гэта, а таксама ізаляцыя ад амаль усяго свету, прывялі да запавольвання эканамічнага развіцця Албаніі ўжо ў 1960-я гг. Энвер Ходжа распрацаваў канцэпцыю адмысловага албанскага шляху будаўніцтва сацыялізму. Ён меў на ўвазе самаізаляцыю, прыпыненне індустрыялізацыі, захаванне аграрнага характару албанскага грамадства. Захаваўся ў Албаніі культ асобы Сталіна.

У палітычнай сферы ўмацоўваліся аўтарытарныя рэжымы. На мяжы 1950-х – 1960-х гг. кампартыі краін рэгіёна заявілі аб пабудове асноў сацыялізму ў іх краінах. У 1960 г. аб завяршэнні будаўніцтва асноў сацыялізму заявіў III з'езд Румынскай рабочай партыі (з 1965 г. – Румынская камуністычная партыя), у 1962 г. – VIII з'езд ВСРП, у 1963 г. – VI з'езд САПГ. Перспектывы далейшага развіцця звязваліся з ідэяй больш ці менш адначасовага пераходу сацыялістычных краін да камунізму, якая была прапанавана XXII з'ездам КПСС у 1961 г. Для гэтага існавалі, як лічылася, усе неабходныя аб'ектыўныя ўмовы: у краінах рэгіёна быў створаны значны эканамічны патэнцыял, склаліся адзіныя народнагаспадарчыя комплексы, заснаваныя на буйной машыннай вытворчасці, краіны пераўтварыліся ў індустрыяльна-аграрныя, у Албаніі, Венгрыі, ГДР, Румыніі кааператыўны сектар на вёсцы складаў 93–95 %. Пры правядзенні кааперавання меліся адрозненні ад СССР. Зямля не нацыяналізавалася, а перадавалася ў уласнасць кааператывам. Сялянам часткова кампенсаваўся кошт унесянай імі ў кааператыў маёмасці. Удзельная вага сацыялістычных краін у сусветнай эканоміцы да сярэдзіны

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1960-х гг. дасягнула прыкладна адной трэці ў прамысловай вытворчасці, адной чацвёртай у нацыянальным прыбытку і адной пятай у вытворчасці сельскай гаспадаркі. Былі вырашаны многія сацыяльныя праблемы: ліквідавана беспрацоўе, дастаткова эфектыўна працавалі сістэмы сацыяльнага забеспячэння, аховы здароўя, развіваліся адукацыя і навука, хоць і марудна, але рос жыццёвы ўзровень насельніцтва.

Палітычнае жыццё 1960-я – 1970-я гг. у краінах рэгіёна адзначалася глыбокім разыходжаннем паміж увесь час дэклараваўшымся народным, сацыялістычным характарам улады і фактычна манапольнай палітычнай, эканамічнай і ідэалагічнай уладай камуністычнай партыйна-дзяржаўнай вярхушкі над грамадствам. Па канстытуцыях вышэйшым органам ўлады лічыліся выбіраемые ўсенародна парламенты: Народная палата ў ГДР, Дзяржаўны сход у Румыніі, Народны сход у Албаніі. Яны выбіралі са свайго складу пастаянны калектыўны кіруючы орган рэспублікі (Прэзідыум, Дзяржаўны савет). У Румыніі ў 1974 г. была ўведзена пасада прэзідэнта. Фактычна ўлада належала партыйна-дзяржаўнаму апарату. Камуністычныя партыі ў Албаніі, Румыніі, Венгрыі і ГДР цалкам кантралявалі дзейнасць дзяржаўных органаў, іншых (як у ГДР) палітычных партый. Пад кантролем кампартый функцыянавала сетка грамадскіх арганізацый, у якія было ўключана практычна ўсё насельніцтва. На выбарах у органы ўлады вылучаўся адзін спіс кандыдатаў (кандыдат), альтэрнатывы якому не было. Толькі ў Венгрыі ў канцы 1960-х гг. пачало практыкавацца вылучэнне на выбарах на адно месца двух ці болей кандыдатаў.

**5.** У сярэдзіне 1970-х гг. вядучыя індустрыяльныя краіны ўступілі ў новы этап НТР. Ён патрабаваў лібералізацыі эканамічных адносін, прасторы для прадпрымальніцкай дзейнасці, творчай працы ад работніка. Камуністычныя рэжымы аказаліся няздольнымі забяспечыць названыя ўмовы для інтэнсіфікацыі развіцця экономікі. Пакуль меўся прастор для экстэнсіўнага развіцця эканомікі, якое забяспечвалася пастаўкамі таннай сыравіны з СССР і прытокам рабочай сілы з вёскі, сацыялістычныя краіны Еўропы мелі нядрэнныя паказчыкі росту вытворчасці. Праўда назіралася дыспрапорцыя: рост вытворчасці дасягаўся пераважна за кошт цяжкай прамысловасці, а галіны, якія выпускалі тавары народнага спажывання, адставалі.

У 1970-я гг. магчымасці для экстэнсіўнага росту экономікі сацыялістычных краін Еўропы былі вычарпаны. Забяспечыць пераход да эканамічнага росту на аснове ўкаранення дасягненняў НТР бюракратычная сістэма кіравання экономікай не змагла. Нават ГДР і Венгрыя адставалі па прадукцыйнасці працы ў 2–2,5 разы, па рэсурсаёмістасці вытворчасці – у 1,5–2 разы ад вядучых індустрыяльных краін Захаду. Празмерная матэрыялаёмістасць і энергаёмістасць, нізкая якасць тавараў рабіла іх неканкурэнтаздольнымі на сусветным рынку. На сусветных рынках з сярэдзіны 1970-х гг. назіралася значнае падзенне цэн на тавары краін ЦПУЕ. Слабой была аграрная сфера. Ураджайнасць у краінах СЭУ складала 50 %

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ураджайнасці ад краін ЕЭС. Ужо ў 1970-я гг. тэмпы эканамічнага росту запаволіліся.

Асабліва неспрыяльнымі для сацыяльна-эканамічнага развіцця сацыялістычных краін Еўропы сталі 1980-я гг. Сусветны эканамічны крызіс 1980–1982 гг. прымусіў Захад зрабіць умовы крэдытавання сацыялістычных краін больш жорсткімі ці нават адмаўляць у новых крэдытах. Сваю ролю адыграла і абвастрэнне міжнароднай напружанасці. Да сярэдзіны 1980-х гг. яскрава праявіліся эканамічная неэфектыўнасць і палітычная недэмакратычнасць мадэлі «рэальнага сацыялізму», якія ва ўмовах уступлення ўсяго свету ў эпоху бурнага паскарэння НТП выявілі і даказалі неабгрунтаванасць гэтай мадэлі самой па сабе і ў параўнанні з тагачасным развітым капіталізмам. У 1986–1989 гг. рост нацынальнага даходу сладаў у ГДР 1,8 %, Венгрыі каля 1 %, у Румыніі – каля 0 %.

У 1970-я гг. у сацыялістычных краінах былі прыняты праграмы будаўніцтва “развітога сацыялізму” і пераходу да камунізму. Прычым нават Албанія збіралася зрабіць гэта за 15–20 гадоў. Было абвешчана, што ва ўмовах будаўніцтва “развітога сацыялізму” яшчэ больш узрастае роля камуністычных партый у грамадскім жыцці. У канстытуцыях сацыялістычных краін з’явіліся артыкулы, якія юрыдычна замацоўвалі кіруючую ролю кампартый.

Краіны ЦПУЕ паўтаралі асноўныя рысы савецкай мадэлі сацыялізму: аднапартыйная дыктатура кампартый, адсутнасць арганізаванай апазіцыі, дзяржаўная цэнтралізаваная эканоміка. Але пры гэтым у розных краінах меліся асаблівасці. З 4 разглядаемых намі неславянскіх краін у дзвюх склаліся таталітарныя рэжымы – Румынія і Албанія. Яны тут не набылі такой завершанай формы як, напрыклад, у нацысцкай Германіі, ці сталінскім СССР. Румынія і Албанія вызначаліся сярод сацыялістычных краін адсталай сацыяльнай структурай (даіндустрыяльнай) і нізкай палітычнай культурай. Гэтыя фактары спрыялі фарміраванню тут таталітарных дыктатур.

Фарміраванне таталітарнага рэжыму ў Румыніі звязана з кіраваннем Н. Чаушэску. Ён стаў першым сакратаром ЦК РКП у 1965 г. Заняўшы важнейшыя партыйныя пасады, а з 1974 г. і дзяржаўныя, Чаушэску прызначыў на кіруючыя пасады ў партыі і дзяржаве сваякоў. Ён адхіліў ад прыняцця рашэнняў нават палітбюро ЦК РКП і ўсе важнейшыя пытанні прымаў асабіста. Апарой дыктатара з’яўлялася палітычная паліцыя “секурытатэ”, якая кантралявала жыццё практычна кожнага румына. Склаўся культ асобы Чаушэску, які атрымаў тытул “наймудрэйшы рулявы”, а час яго кіравання сталі называць “залатой эпохай”. Чаушэску імкнуўся дэманстраваць незалежнасць ад СССР. Ён асудзіў інтэрвенцыю ў Чэхаславакію ў 1968 г., Румынія прыняла ўдзел у алімпіядзе ў Лос-Анжэлесе ў 1984 г., якую сацыялістычны лагер байкатаваў. За такую пазіцыю ў дачыненні да СССР Чаушэску разлічваў атрымаць заходнія крэдыты. Аднак у 1980-я гг. стала відавочна, што знешняя запазычанасць перавышае плацяжздольнасць краіны. Тады Чаушэску абвясціў задачу пагасіць знешнюю запазычанасць. Амаль адзінай крыніцай валютнай выручкі для

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

краіны стаў экспарт энерганосьбітаў. Каб яго павысіць спажыванне электраэнергіі ўнутры краіны скарацілі да мінімума, увялі ліміты.

У Албаніі Ходжы праводзіў палітыку ізаляцыі і ад капіталістычных краін, і ад сацыялістычнага лагера. Адносіны з СССР былі разарваны яшчэ ў 1960-я гг., а ў 1978 г. – з Кітаем. Албанцы не маглі мець у прыватным карыстанні аўтамабілі, усе тавары размяркоўваліся па картках. Велізарныя сродкі ішлі на будаўніцтва бункераў на выпадак вайны з “імперыялізмам і рэвізіянізмам”. Ходжы знішчаў сваіх палітычных паплечнікаў па партыйнаму кіраўніцтву. Сфарміраваўся яго культ. Албанская партыя працы (АПП) мела поўную манаполію на ўладу. Органы бяспекі (сігурымі) ажыццяўлялі татальны кантроль над грамадствам і ліквідавалі ўсялякае іншадумства.

Некалькі іншай была сітуацыя ў Венгрыі і ГДР. Тут аўтарытарныя рэжымы не перараслі ў таталітарныя. У Венгрыі існаваў плюралізм у культурным жыцці, існавалі незалежныя ад дзяржавы грамадскія арганізацыі. Не склаўся культ асобы Кадара. Але манаполія ВСРП на ўладу была непахіснай. Эканамічныя рэформы Кадара дазволілі стварыць дастаткова высокі ў параўнанні з іншымі сацыялістычнымі краінамі ўзровень жыцця. У ГДР захоўвалася бачнасць існавання шматпартыйнай сістэмы. Захоўваліся элементы грамадзянскай супольнасці ў культурнай сферы.

**6.** У канцы 1980-х гг. кразіс ахапіў усе сферы грамадскага жыцця сацыялістычных краін ЦПУЕ: эканамічную, палітычную, сацыяльную, ідэалагічную, маральную. Пераменам спрыяла перабудова, якая пачалася ў СССР. Яна была ўспрынята ў сацыялістычных краінах неадназначна. ВСРП яе падтрымала, а САПГ, РКП, АПП фактычна адверглі. Важна было, што ў новых умовах удзельнікі рэвалюцый маглі не апасацца савецкага ўмяшання.

Галоўная прычына рэвалюцыі – гэта неэфектыўнасць сацыяльна-эканамічнай мадэлі, якая існавала ў сацыялістычных краінах (аб чым гаворка ішла вышэй). Развіццё сродкаў інфармацыі дазволіла людзям з сацыялістычных краін рэальна ацаніць узровень свайго жыцця ў параўнанні з жыхарамі капіталістычных краін. У 1980-я гг. значна ўзрасла колькасць высокакваліфікаваных рабочых, якія мелі больш высокі ўзровень палітычнай культуры і ўспрымалі як важныя для сябе дэмакратычныя каштоўнасці. У структуры насельніцтва значна ўзрасла доля тых, хто нарадзіўся пасля вайны. Гэтыя людзі, як правіла, ужо не бачылі патэнцыяльнай пагрозы з боку Германіі, не разглядалі СССР як вызваліцеля, а саюз з ім як гарантыю супраць магчымай новай германскай агрэсіі. Адсюль жаданне пакончыць з залежнасцю ад Савецкага Саюза. У ідэалагічнай сферы быў моцна дыскрэдытаваны марксізм-ленінізм, які абгрунтоўваў усеўладдзе кампартый, іх бестэрміновае кіруючае становішча ў грамадстве. Насельніцтва стамілася ад шматгадовага праўлення адных і тых жа камуністычных лідараў, як правіла, ужо прыстарэлых. Грамадства раз’ядала карупцыя, у якую былі ўцягнуты прадстаўнікі партыйна-дзяржаўнага апарата. У свядомасці насельніцтва пачалі зацвярджацца сацыял-дэмакратычныя і ліберальныя погляды. Агульным імкненнем удзельнікаў рэвалюцый у розных краінах

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

была ліквідацыя манаполіі кампартый на ўладу. Гэта былі буржуазна-дэмакратычныя, нацыянальныя рэвалюцыі, масавыя і стыхійныя.

У Венгрыі ва ўмовах нарастаўшых эканамічных цяжкасцей і пад уплывам перабудовы ў СССР правячая ВСРП асэнсавала неабходнасць пераўтварэнняў і выступіла ініцыятарам рэформ. У маі 1988 г. Я. Кадар пакінуў пост генеральнага сакратара ЦК ВСРП і да кіраўніцтва партыяй прыйшлі рэфарматары на чале з Караям Грасам. У пачатку 1989 г. пленум ЦК ВСРП прызнаў неабходнасць для партыі адмовіцца ад манаполіі на ўладу. У гэты час у Венгрыі ўжо ішоў працэс узнікнення арганізаванай апазіцыі. У 1987 г. быў створаны Венгерскі дэмакратычны форум, аднавілі дзейнасць Партыя дробных сельскіх гаспадароў (ПДСГ) і Сацыял-дэмакратычная партыя (СДП). ВСРП пайшла на дыялог з апазіцыяй у рамках "круглага стала", які адбываўся ў красавіку – маі 1989 г. Згодна дасягнутым пагадненням краіна павінна была перайсці да парламенцкай дэмакратыі. ВСРП рэарганізўвалася ў партыю парламенцкага тыпу. Дзейнасць яе арганізацый у ўзброеных сілах, спецслужбах спынялася. Рэфармаванне ВСРП было завершана на яе з'ездзе ў кастрычніку 1989 г. Яна была ператворана ў Венгерскую сацыялістычную партыю (ВСП). Новая партыя выказалася за рыначную эканоміку і парламенцкую дэмакратыю, па сутнасці стала партыяй еўрапейскай сацыял-дэмакратыі. Тая частка партыі, якая засталася на камуністычных пазіцыях, аднавіла дзейнасць ВСРП. Першыя свабодныя парламенцкія выбары, якія адбыліся ў сакавіку 1990 г., завяршылі дэмантаж аўтарытарнага рэжыму ў Венгрыі. Такім чынам, характэрнай рысай ліквідацыі аўтарытарнага сацыялізму ў Венгрыі быў мірны характар гэтага працэсу. Прычым, ініцыяваны ён быў правячай партыяй.

Кіраўніцтва ГДР у адказ на перабудову ў СССР вылучыла лозунг "сацыялізм у колерах ГДР". На практыцы гэта азначала курс на кансервацыю існуючай сістэмы. Аднак у ГДР нарастаў пратэст супраць існуючага камуністычнага рэжыму. Самай масавай яго формай стаў ад'езд жыхароў ГДР у ФРГ. Летам 1989 г., калі Венгрыя адкрыла граніцу з Аўстрыяй, каля 200 тыс. усходніх немцаў праз яе перабраліся ў ФРГ. Адначасова ў ГДР пачаліся маніфестацыі пад лозунгам "Мы не хочам ад'язджаць!". Іх удзельнікі патрабавалі палітычных і эканамічных рэформ. Першая буйная дэманстрацыя адбылася 15 студзеня 1989 г. у Лейпцыгу.

Нягледзячы на масавыя пратэсты, САПГ імкнулася захаваць манаполію на ўладу. Толькі 18 кастрычніка 1989 г. пад ціскам пратэстаў пайшоў у адстаўку Э. Хонекер. На чале партыі стаў Й. Крэнц. Але гэтыя змены не спынілі пратэсты. У такой сітуацыі 9 лістапада кіраўніцтва ГДР вымушана было адкрыць мяжу з Заходнім Берлінам. Дэманстранты разграмілі штаб-кватэру палітычнай паліцыі "штазі". Сабраўшаяся сесія Народнай палаты выключыла з канстытуцыі артыкул аб кіруючай ролі САПГ. Быў сфарміраваны пераходны ўрад на чале былым сакратаром акружкама САПГ Хансам Модравым. САПГ пакінула 500 тыс. чалавек. У снежні 1989 г. адбыўся яе з'езд, на якім ранейшае кіраўніцтва было асуджана за злоўжыванне ўладай і злачынствы супраць народа. Партыя абвясціла аб

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

арыентацыі на ідэі еўрапейскай сацыял-дэмакратыі і стала называцца Партыяй дэмакратычнага сацыялізму (ПДС). Такім чынам, у ГДР САПГ не змагла асэнсаваць неабходнасці рэформ і перайсці да іх ажыццяўлення. Падзенне аўтарытарнага сацыялізму адбылося ў выніку масавых выступленняў насельніцтва, якія насілі мірны характар.

Пасля ліквідацыі манаполіі САПГ на ўладу цэнтральным у жыцці ГДР стала пытанне аб аб’яднанні з ФРГ. Аб’яднальны працэс паскорыўся пасля першых свабодных выбараў у гісторыі ГДР 18 сакавіка 1990 г. На іх перамагла кааліцыя правых партый “За Германію” на чале з ХДС. ПДС атрымала толькі 16 % галасоў. Сфарміраваны правымі ўрад 1 ліпеня падпісаў з ФРГ дагавор аб валютным, эканамічным і сацыяльным саюзе, а 31 жніўня аб палітычным аб’яднанні Германіі на аснове 23 артыкула канстытуцыі ФРГ.

Румынія была адзінай неславянскай краінай Еўропы, дзе крушэнне сацыялізму суправаджалася крывавымі сутыкненнямі. Гэта было звязана з тым, што рэжым Чаушэску імкнуўся да апошняга захаваць уладу. Калі ў 1987 г. у г. Брашаў пачалася забастоўка рабочых, на яе падаўленне былі кінуты атрады “секурытатэ”. Калі ў пачатку 1989 г. да Чаушэску з адкрытым лістом звярнуліся 6 былых кіруючых дзеячаў РКП і абвінавацілі яго ў антынароднай палітыцы, іх абвясцілі шпіёнамі Захаду і СССР. Жорстка падаўляліся выступленні венгерскай меншасці ў Трансільваніі.

Улады 15 снежня 1989 г. у г. Цемішаара, у якім жылі этнічныя венгры, паспрабавалі дэпарціраваць пастыра Ласло Цекаша. Сабраўся натоўп, каб перашкодзіць гэтаму. Салдаты адкрылі агонь. Гэтыя падзеі далі штуршок пратэстам. 21 снежня пачаліся хваляванні ў Бухарэсце. На наступны дзень падраздзяленні “секурытатэ” адкрылі агонь па пратэстоўцах. Але на бок паўстанцаў у асноўнай масе перайшла армія. У Бухарэсце баі ішлі некалькі дзён, пакуль паўстанцы не ўстанавілі кантроль над сталіцай. Чаушэску быў захоплены ваеннымі і пасля фармальнага суда разам з жонкай расстраляны.

Адрозненне сітуацыі ў Румыніі ў параўнанні з ГДР і Венгрыяй заключалася ў тым, што на момант звяржэння Чаушэску тут не існавала ніякай арганізаванай апазіцыі. Паўстанне было вынікам стыхійнага выбуху народнага незадавальнення. Толькі ўжо ў час барацьбы ўзнік Фронт нацыянальнага выратавання (ФНВ). Яго стварылі апазіцыйна настроеныя да Чаушэску камуністычныя функцыянеры на чале з Іонам Іліеску. ФНВ стварыў новыя органы ўлады і планаваў першапачаткова абмежавацца толькі рэарганізацыяй верхніх эшалонаў улады. Аднак пад ціскам мас таталітарная сістэма была разбурана цалкам. РКП спыніла сваю дзейнасць. “Секурытатэ” была распушчана, армія дэпалітызавана. Аднавілі дзейнасць Нацыянал-царанісцкая і Нацыянал-ліберальная партыі. У маі 1990 г. адбыліся свабодныя парламенцкія выбары. На іх перамогу атрымаў ФНВ. Такім чынам, у Румыніі ва ўладзе засталіся прадстаўнікі камуністычнай партыйнай наменклатуры, якія стаялі на рэфарматарскіх пазіцыях.

У Албаніі АПП прызнала неабходнасць перамен. Пасля смерці ў 1985 г. Ходжы новым кіраўніком партыі стаў Раміз Алія. На з’ездзе партыі ў 1986 г. ён падверг крытыцы палітыку празмернай цэнтралізацыі эканамічнага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

жыцця, выказаўся за пашырэнне эканамічных праў кааператываў. Было дазволена адпраўленне рэлігійных абрадаў. Грамадзяне атрымалі права выязду за мяжу, краіна пачала выходзіць з рэжыму самаізаляцыі. Але цяжкасці ў эканоміцы працягвалі нарастаць. У 1989–1990 гг. пачаўся глыбокі эканамічны крызіс. Нацыянальны даход скараціўся на 13 %. Пачаліся хваляванні, асноўнай сілай якіх былі студэнты. У такіх умовах Нацыянальны сход прыняў рашэнне аб пераходзе да шматпартыйнай сістэмы. Алія выдаліў з кіраўніцтва партыі адкрытых сталіністаў, заявіў аб неабходнасці пераходу да рыначнай эканомікі. Усё гэта падавалася як пераадоленне памылак у будаўніцтве сацыялізму. Фактычна Алія планаваў абыйсціся некаторымі рэформамі пры захаванні сацыялістычнай мадэлі развіцця. Апазіцыя стварыла Рэспубліканскую і Дэмакратычную партыі. Але выбары ў парламент, якія адбыліся ў сакавіку 1991 г., прынеслі перамогу АПП. Камуністы сфарміравалі аднапартыйны ўрад. А 30 красавіка 1991 г. Р. Алія быў абраны прэзідэнтам.

Фармальна ў Албаніі адбылося вяртанне да дэмакратычнага праўлення. На з’ездзе ў чэрвені 1991 г. АПП была перайменавана ў Сацыялістычную партыю Албаніі (СПА). Была адпраўлена ў адстаўку старая партыйная гвардыя. На парламенцкіх выбарах у сакавіку 1992 г. перамогу атрымала Дэмакратычная партыя. Тым самым адбыўся пераход Албаніі да рэальнага парламентарызму.

**Книга**
74.266.3 Л178

**Лазько, Григорий Григорьевич.**
Авторитарно-бюрократический социализм в европейских странах : становление и крах : пособие для учителей / **Григорий Григорьевич Лазько**, **Гомельский государственный университет им. Ф. Скорины**, **Гомельский областной совет педагогического общества Беларуси** . – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 1992 . – 37 с. : 4 р.

ББК 74.266.3

71.122.6(4Беі3) В 12

**Вабішчэвіч, Аляксандр Мікалаевіч.**
Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921 - 1939 г.г.) : навуковае выданне : манаграфія / **Аляксандр Мікалаевіч Вабішчэвіч** . – Брэст : БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2008 . - 116348 . – 41 . – аб.2 : 0.00 .

ББК 71.122.6(4Беі3)+63.3(4Беі3)614-38

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ